**Жардзецкая А.У. (Мінск)**

# Мастацкае ўвасабленне пейзажу ў паэмах “Яўгеній Анегін” Аляксандра Пушкіна і “Новая зямля” Якуба Коласа

У творчасці кожнага вялікага майстра слова ёсць самы значны, самы любімы твор, у якім з выключнай мастацкай сілай увасоблены маральныя і эстэтычныя ідэалы аўтара як асобы.

У творчасці А. Пушкіна такім творам з’яўляецца раман у вершах “Яўгеній Анегін”, у творчасці Якуба Коласа – паэма “Новая зямля”.

“Яўгеній Анегін” – гэта геніяльны твор паэта, па словах В. Бялінскага, “энцыклапедыя рускага жыцця” таго часу. “Новая зямля” Якуба Коласа – гэта класічны твор беларускай літаратуры, на думку А. Лойкі, “эпахальная энцыклапедычная паэма, твор нацыянальнага жыцця”.

Супастаўленне карцін прыроды ў рамане “Яўгеній Анегін” і паэме “Новая зямля” пацвярджае думку даследчыкаў адносна таго, што інтэрпрэтацыя ўзаемаадносін чалавека і прыроды “заўсёды ёсць знак свайго часу, код да яго расшыфроўкі”.

Карціны прыроды ў А. Пушкіна і Я. Коласа сапраўды – адлюстраванне эпохі, мера часу і велічы чалавека, выражэнне светаўспрыняцця і светаадчування аўтараў. Раман Пушкіна “Яўгеній Анегін” ствараўся ў першай палавіне XIX ст. Сэнс ідэйнага развіцця паэта ў гэты перыяд зводзіўся да пераадолення рамантызму, да разумення аб’ектыўных законаў гістарычнага развіцця грамадства, да высвятлення сапраўднай ролі народа ў гістарычным працэсе.

Важнейшай для Пушкіна аказалася праблема ўзаемаадносін асобы і народа. На думку паэта, актыўнай сілай гісторыі, якая вызначае ход яе падзей, з’яўляецца не асобны чалавек, а народ. Асоба аказваецца здольнай здзейсніць вялікае і значнае толькі тады, калі звязана з народам і выражае яго волю. У сувязі з разуменнем ролі народа ў гісторыі грамадства і дзяржавы Пушкін па-новаму паставіў пытанне аб народнасці літаратуры.

Вялікім мастацкім адкрыццём Пушкіна, якое вызначыла глыбіню яго рамана “Яўгеній Анегін”, і было гэта новае, глыбока філасофскае, прапушчанае праз прызму народнасці ўспрыняцце жыцця. Пра што б ні пісаў Пушкін у гэты перыяд, за ўсім стаяла вялікае і мудрае жыццё народа, якое вызначала лёс герояў, іх духоўнасць.

Прынцыпова новы характар набылі ў творах паэта апісанні прыроды. Пушкін выйшаў за межы традыцыйнага, бо адчуў неабходнасць палемічнага сцверджання рэалістычнага спосабу раскрыцця роднай прыроды як неад’емнай часткі народнага жыцця. Адкрыўшы 5-ю главу рамана апісаннем зімы (“Зима!.. Крестьянин, торжествуя, на дровнях обновляет путь...”) ён як бы спыняе сябе і тлумачыць: “Но, может быть, такого рода / Картины вас не привлекут: / Всё это низкая природа; / Изящного не много тут <…> Другой поэт роскошным слогом / Живописал нам первый снег / И все оттенки зимних нег...” [2, с. 260].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

“Другой поэт” – гэта П. Вяземскі. На яго верш “Першы снег” і спасылаецца Пушкін. На яго думку, такая паэзія далёкая ад “нагой простоты”, якая не бачыць прыгажосці жывога жыцця.

Зусім інакш апісана прырода ў Пушкіна. Зіма ці восень, лета ці вясна – гэта не проста розныя поры года, розныя фарбы, асаблівыя прыкметы. Гэта перш за ўсё пэўныя ўстойлівыя абставіны і формы народнага жыцця, якія складваліся на працягу вякоў. Кожная пара года вызначаецца сваім вобразам жыцця і працы, ёй уласцівы свой быт, звычаі, гульні і г. д. Прырода зліваецца з жыццём народа: “Зима!.. Крестьянин, торжествуя, / На дровнях обновляет путь; / Его лошадка, снег почуя, / Плетётся рысью как-нибудь; / Бразды пушистые взрывая, / Летит кибитка удалая; / Ямщик сидит на облучке / В тулупе, в красном кушаке” [2, с. 260].

Такая зіма ўспрымаецца як руская. Рускімі аказваюцца звычаі, з’явы прыроды і жыцця. Тым самым праз прыроду ў раман “Яўгеній Анегін” уваходзіць тэма Расіі, рускага, народнага. Апісанні прыроды становяцца той жывой атмасферай, у якой жывуць героі твора: “Татьяна (русская душою, / Сама не зная почему) / С её холодною красою / Любила русскую зиму...” [2, с. 260].

Зіму любіць, безумоўна, і сам Пушкін. Для яго гэта пара года – сапраўдная чараўніца. Сваё захапленне ёю паэт шчыра выказвае ў лірычных адступленнях: “Вот север, тучи нагоняя, / Дохнул, завыл – и вот сама / Идёт волшебница зима... / Мелькает, вьётся первый снег, / Звездами падая на брег” [2, с. 304].

Увогуле суб’ектыўны лірычны пачатак у “Яўгеніі Анегіне” займае выключна важнае месца, бо ў рамане ўвесь час адчуваецца прысутнасць паэта, нават нібы чуцен яго голас.

Вядома, што любімай гераіняй Пушкіна была Таццяна (“Я так люблю Татьяну милую мою”). Такая цеплыня адносін у значнай ступені тлумачыцца тым, што ёй былі блізкімі народнае жыццё, песні, гаданні і, безумоўна, руская прырода, якую Таццяна не толькі любіла, але і адчувала ўсёй сваёй паэтычнай душой. Яна была духоўна паяднана з прыродай, ёй цяжка нават хоць на нейкі час адарвацца ад родных ёй краявідаў. З прыродай Таццяна гаворыць, як з жывой істотай, як з найлепшым сябрам: “Вставая с первыми лучами, / Теперь она в поля спешит / И, умилёнными очами / Их озирая, говорит: / “Простите, милые долины, / И вы, знакомых гор вершины, / И вы, знакомые леса; / Прости, небесная краса, / Прости, весёлая природа...” [2, с. 303].

Вялікае месца ў Пушкіна займаюць лірычныя адступленні ацэначнага характару, дзе аўтар выказвае свае адносіны не толькі да герояў твора, але і да пэўных малюнкаў прыроды, да кожнай пары года. Самай любімай з іх была для Пушкіна восень: “Прощальная краса, очей очарованье...” Усяго чатыры словы, а колькі думак і пачуццяў увасоблена ў іх! Яны выклікаюць светлы сум, трапяткое захапленне прыродай і ў той жа час адчуванне – паэт убачыў восень менавіта так, як можа ўбачыць толькі той, хто надзелены незвычайным талентам адчуць хараство прыроды і душой зліцца з ёю: “Уж небо осенью дышало, / Уж реже солнышко блистало, / Короче становился день. / Лесов таинственная осень / С печальным шумом обнажалась, / Ложился на поля туман, / Гусей крикливых

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

караван / Тянулся к югу, приближалась / Довольно скучная пора; / Стоял ноябрь уж у двора” [2, с. 254].

Узвелічэнню вобраза восені садзейнічае запаволены рытм верша, паэт нібы не можа адарваць вачэй ад гэтай прыгажосці. Ён заўважае ўсё і хоча, каб убачыў і чытач “в багрец и золото одетые леса”, как “мглой волнистою покрыты небеса”. Пушкін адыходзіць ад дробязнага, мітуслівага, ён стварае малюнак, поўны і прыгажосці і дабрыні.

Змястоўнасць паэзіі Пушкіна, чысціня пачуццяў паэта, “дум высокое стремленье” – усё гэта вабіла Якуба Коласа. Яму хацелася пісаць менавіта так, як пісаў любімы ім Пушкін. Першы яго верш “Вясна”, як сцвярджаюць многія даследчыкі, менавіта і быў вынікам уплыву рускага паэта.

“Яўгеній Анегін” А. Пушкіна і “Новая зямля” Я. Коласа з‘явіліся ў свет у розны час. Паміж падзеямі, апісанымі Пушкіным і Коласам, пралягла цэлая гістарычная эпоха. Раман “Яўгеній Анегін” ствараўся ў пачатку XIX ст., “Новая зямля” – у пачатку XX ст. За час, які аддзяляе гэтыя творы, адбыліся кардынальныя змены ў грамадскім жыцці двух народаў – рускага і беларускага. Гэтыя змены аказалі вялікі ўплыў на характар і паводзіны герояў, іх адносіны да жыцця, прыроды... І калі ўвага Пушкіна звернута ў асноўным на прадстаўнікоў дваранскага асяроддзя, то ў Я. Коласа ў цэнтры ўвагі звычайны селянін, светапогляд якога абумоўлены яго працоўнай дзейнасцю. І ўвогуле сам Я. Колас па свайму душэўнаму і псіха- лагічнаму складу быў селянінам і на ўсё жыццё застаўся ім, нават тады, калі стаў сусветна вядомым пісьменнікам, акадэмікам. Сваім псеўданімам яшчэ на пачатку творчай дарогі малады паэт быццам падкрэсліў, што ўсім жыццём і творчасцю заўсёды будзе цесна звязаны з роднай зямлёй, што стане неад’емнай часцінкай свайго народа. З яго жыцця, як з найглыбейшай крыніцы, будзе чэрпаць думкі і надзеі, матывы і фарбы.

На працягу ўсёй паэмы “Новая зямля” гучаць патрыятычныя матывы, пачынаючы з узнёслага прызнання ў любові да бацькаўшчыны (“Мой родны кут, як ты мне мілы!..”) і ў далейшым раскрыцці казачнай прыгажосці роднага краю. Глыбокім лірычным пачуццём прасякнута апісанне лесніковай пасады і Парэчча, дзе жывуць яго героі: “Парэчча – слаўная мясціна, / Куток прыгожы і вясёлы: / Як мора – лес, як неба – долы, / Зіхціць у кветках лугавіна... / А колькі ягад і парэчак! / Як пахне мёдам поле грэчак, / Калі пачнуць яны цвісці!..” [1, с. 96].

Безумоўна, малюнкі прыроды ў “Яўгеніі Анегіне” Пушкіна і ў “Новай зямлі” Я. Коласа сугучны сваёй паэтычнасцю, тонкасцю эстэтычнага ўспрыняцця прыроды двума геніяльнымі мастакамі слова. І ў аднаго, і ў другога моцна выяўлены суб’ектыўны пачагак, характар якога ў многім розніцца. Суб’ектыўнае “я” Пушкіна, калі можна так сказаць, дваранскага паходжання, Колас жа, як ўжо адзначалася, сын зямлі сваёй, да таго ж, яго паэма “Новая зямля” напісана на аўтабіяграфічным матэрыяле.

Гэта, па сутнасці, паэма пра родны кут, праз які Колас паказвае ўсю Беларусь. Тут мы сустракаем дакладныя геаграфічныя назвы мясцін роднага кута паэта. Ён рос каля тых дрэў, якія апаэтызаваў у сваім творы: “Мой родны кут, як ты

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

мнс мілы! / Забыць цябе не маю сілы. / Вось, як цяпер, перада мною / Устае куточак той прыгожы, / Крынічкі вузенькае ложа / І елка ў пары з хваіною / Стаяць, абняўшысь, над вадою...” [1, с. 4].

Зазначым, што ў “Новай зямлі” значна больш пейзажных, малюнкаў, таму што жыццё і побыт коласаўскіх герояў звязаны з прыродай самым непасрэдным чынам. Для герояў Пушкіна вёска – гэта толькі месца адпачынку ад мітуслівага гарадско- га жыцця, толькі – прадмет любавання. Для герояў Коласа вёска, прырода – гэта само жыццё. Народ зямлі, дзеці прыроды – вось што такое героі-сяляне “Новай зямлі”. У выніку свет прыроды ў паэме Коласа – шматмерны, чароўны, ідэалізаваны, як і ў Пушкіна, але разам з тым загадкавы, сумны, будзённы.

Услаўляючы селяніна-працаўніка, Я. Колас паэтызуе ў "Новай зямлі" ўсё, што так ці інакш звязана з яго жыццём. Свайго героя паэт бачыць у цесным яднанні з прыродай. У гэтым яднанні – найглыбейшая крыніца паэтычнасці твора Я. Коласа: “Ідуць касцы, звіняць іх косы, / Вітаюць іх буйныя росы, / А краскі ніжай гнуць галовы, / Пачуўшы косак звон сталёвы. / Касцы ідуць то грамадою, / То паасобку, то па пары; / Ідуць касцы, ідуць, як хмары, / І льецца смех іх разудалы.” [1, с. 197].

У паэме “Новая зямля” гучыць гімн родным дарогам: “Дарогі, всчныя дарогі! / Знаць, вам спрадвеку самі богі, / Калі красёнцы жыцця ткалі, / І вашы слёзы вызначалі, / Няма канца вам і спачыну; / Вы жывы кожную часіну...” [1, с. 223].

Гэта дарогі яго роднага краю, дарогі беларускія. Пейзажны вобраз дарогі ў паэме “Новая зямля” наводзіць на глыбокі філасофскі роздум, ён уплывае на псіхіку і настрой душы. Дарога становіцца для многіх герояў Я. Коласа ўвасабленнем духоўных шуканняў і выбару.

Пейзаж у паэме “Новая зямля” нацыянальна адметны, як і ўвесь гэты твор. Кожны вобраз, радок, кожнае слова ў ім нацыянальна непаўторныя, бо жывапіс словам у Коласа тыпова беларускі, ён звязаны з народным светаадчуваннем, светабачаннем. Вось як, напрыклад, ён апісвае восень: “На ніцях белай павуціны / Прывозяць восень павучкі. Яе красёнцы, чаўначкі / У моры лесу мільганулі / І лісце ў багру апранулі; / І з кожнай лісцевай галоўкі / Глядзіць твар восені-сяброўкі [1, с. 112].

У апісанні восені Колас знаходзіць новыя мастацкія дэталі, пераканаўча паказвае характэрныя прыкметы беларускай восені: “Восень ткала ўжо красёнцы мяккай чырвані ў лістах; восень прала кужаль тонкі – павуціння белы лён...” [1, с. 113].

Але любімай парой года паэта была вясна. Ён любіў усё ранняе, у тым ліку і раніцу. Для паэта вясна і раніца – не проста стан прыроды, а маладосць года, маладосць дня, іх новае нараджэнне, якое несла радасць. Да вясны паэт звяртаецца, як да жывой істоты: “Ты нясі нам радасць, сілачку нясі!”

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У паэме "Новая зямля" паказана ранняя беларуская вясна з яе першымі баразнамі свежай узаранай зямлі, звонкім крыкам птушак, што вярнуліся здалёк у родныя мясціны.

Вобраз вясны ў Коласа, як і ў Пушкіна, з’яўляецца сімвалам адышоўшай маладосці і разам з тым абнаўлення. Светлы сум і душэўнае хваляванне лірычнага героя выражаюцца ў “Новай зямлі” ў вершах, блізкіх па сваёй танальнасці да пушкінскіх: “Вясна, вясна! Не для мяне ты! / Не я, табою абагрэты, / Прыход твой радасны спаткаю, – / Цябе навек, вясна, хаваю... / Нс всрнешся, як хваля тая, / Ка мне, вясна ты маладая” [1, с. 4].

Параўнаем у Пушкіна: “Как грустно мне твоё явленье, / Весна, весна! пора любви! / Какое томное волненье / В моей душс, в моей крови! / Мы помним горькую утрату, / Внимая новый шум лесов; / Или с природой оживлённой / Сближаем думою смущённой / Мы увяданье наших лет, / Которым возрожденья нст...” [2, с. 294].

Такім чынам, у паэме “Новая зямля”, як і ў рамане “Яўгеній Анегін”, удала спалучаны эпічная шырыня раскрыцця народнага жыцця і моцны струмень лірызму, надзвычай разнасгайны і багаты па формах выяўлення.

І А. Пушкін і Я. Колас стварылі яркія і непаўторныя вобразы прыроды. Іх творчасць была глыбока патрыятычнай, чалавечнай па сваёй сутнасці. Кожны з іх стварыў незабыўны вобраз свайго роднага краю, сваёй Радзімы. У Коласа вобраз Радзімы, несумненна, больш разгорнуты, паглыблены. У Пушкіна ўвага сканцэнтравана ўсё ж такі на ўзаемаадносінах дзеючых асоб, у Я. Коласа – на ўзаемадзеянні чалавека і прыроды. Калі “Яўгеній Анегін” – энцыклапедыя рускага жыцця, то “Новая зямля” – энцыклапедыя жыцця беларускага сялянства, энцыклапедыя беларускай прыроды, любові да роднай зямлі. Пушкін і Колас, кожны па-свойму, выказаў нацыянальную сутнасць, дух свайго народа, ментальнасць рускага і беларуса. Творчасць аднаго і другога паэта сталі здабыткамі сусветнай літаратуры.

Літаратура

1. Колас Я. Новая зямля. Сымон-музыка: Паэмы / Якуб Колас. – Мінск: Юнацтва, 1998. – 447 с.
2. Пушкин А.С. Сочинения. В 3-х т. Т.2. Поэмы; Евгений Онегин: Роман в стихах / А.С. Пушкин. – Минск: Маст. лит., 1986. – 527 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ